Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
__________________Ю.П.Бондар
«___» _____________2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___ / вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках) напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05*
*Народная творчасць (фальклор)*

Мінск 2011

**Складальнік**

*Т. А. Пладунова,* старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*У. А. Васілевіч,* загадчык кафедры этналогіі і фалькларыстыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*Л. Л. Ражкова,* дацэнт кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 14.04.2011г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 30.06.2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *Т. А. Пладунова*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» з’яўляецца адной з ключавых па падрыхтоўцы кіраўнікоў аматарскіх фальклорных аб’яднанняў этнаграфічнага кірунку, спецыялістаў па арганізацыі фальклорнай дзейнасці на рэгіянальнай дакументальнай аснове.

Дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» разглядае шляхі і сродкі па засваенні і адаптацыі фальклорнага мастацтва і традыцыйнай культуры ў цэлым у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы і накіравана на фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў выкладання фальклорных дысцыплін у вучэбна-выхаваўчых установах рознага тыпу і ўзроўню (сярэдніх адукацыйных школах, цэнтрах пазашкольнай работы, школах мастацтваў, музычных школах, сярэдніх спецыяльных навучальных установах).

Дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» падсумоўвае розныя аспекты комплексу тэарэтычных («Педагогіка», «Псіхалогія», «Прафесійная педагогіка», «Сацыяльна-культурная дзейнасць», «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста») і практычных («Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Фальклорны практыкум», «Этнафанічны практыкум», «Абрадазнаўчы практыкум») дысцыплін і абапіраецца на практычныя навыкі, атрыманыя пры праходжанні вытворчай і канцэртна-выканальніцкай практыкі. Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання спецдысцыплін» акумуліруе прынцыпы этнапедагогікі і разглядае інавацыйныя тэхналогіі іх укаранення ў сучасны вучэбна-выхаваўчы працэс.

*Мэта* дысцыпліны – засваенне метадаў і фарміраванне практычных навыкаў выкладання фальклорных дысцыплін, кіравання фальклорным калектывам ва ўстановах культуры і адукацыі.

*Задачы:*

– азнаямленне з асноўнымі праблемамі выкладання фальклорных дысцыплін на розных ступенях сістэмы вучэбна-выхаваўчых і адукацыйных устаноў;

– вывучэнне форм і метадаў засваення фальклорнага мастацтва;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– азнаямленне з прынцыпамі арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу і выканальніцкай дзейнасці ў фальклорным гурце (класе);

– засваенне правіл вядзення вучэбна-выхаваўчай дакументацыі, прынцыпаў камплектавання вучэбна-метадычнага фонду для правядзення заняткаў і дзейнасці фальклорнага калектыву ў цэлым (вучэбныя праграмы, метадычныя рэкамендацыі, вучэбныя дапаможнікі, рэпертуарныя зборнікі, сцэнарныя распрацоўкі, аўдыявідэатэка аўтэнтычных і постфальклорных узораў).

У выніку вывучэння дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін» студэнт павінен *ведаць:*

– тэорыю і методыку выкладання дысцыплін па народнай творчасці;

– прынцыпы работы з метадычнай літаратурай, неабходнай для асваення розных відаў і жанраў народнай творчасці;

– методыку рэкрэацыйнай і рэпетыцыйнай работы ў аматарскім аб'яднанні;

– прынцыпы выхаваўчай работы ў дзіцячым аматарскім калектыве;

– нарматыўную базу этнакультурнага выхавання і навучання, аховы і пераемнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, комплексныя праграмы і праекты па ажыццяўленні гэтых задач;

– метады мастацка-практычнай фалькларыстыкі па засваенні і ўвасабленні традыцыйнага мастацтва ў аматарскай творчасці.

*Умець:*

– вырашаць пастаўленыя педагагічныя задачы прафесійнага і выхаваўчага планаў;

– выбраць неабходны вучэбна-метадычны матэрыял для правядзення заняткаў;

– фарміраваць рэпертуар гурту, праектаваць сцэнарый мерапрыемства на рэгіянальнай дакументальнай аснове;

– аналізаваць вучэбныя праграмы, дапаможнікі і метадычныя распрацоўкі з мэтай іх адаптацыі ў фальклорным калектыве (пэўнага профілю, ці сінкрэтычнага тыпу);

– распрацаваць праграму фальклорнага гурту, план вучэбных заняткаў, рэпертуарны зборнік, палажэнне пра фальклорнае мерапрыемства (свята, фестываль, выставу);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– валодаць метадамі прымянення фальклорнага матэрыялу ў вучэбнай практыцы спецыяльных (прафесійных) і інтэграваных (агульнаадукацыйных, пазашкольных) устаноў адукацыі, самастойна праводзіць вучэбныя заняткі.

Тэхналагічны інструментарый выкладання дысцыпліны прадстаўлены наступнымі педагагічнымі метадамі навучання:

1) па крыніцы перадачы і ўспрымання інфармацыі: вусныя (гутарка, апавяданне), наглядныя (знаёмства з дэпаніраваным навукова-метадычным фондам, з аўдыя-, відэаматэрыяламі), практычныя (пісьмовыя аналітычныя работы і вучэбна-метадычныя распрацоўкі);

2) па характары пазнавальнай і праектнай дзейнасці: рэпрадуктыўныя, прадуктыўныя, пошукавыя, творчыя;

3) па відах вучэбных заняткаў і дыдактычнай задачы: тлумачэнне, практыкаванне, аналіз, замацаванне.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на замацаванне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў па дысцыпліне і ўключае наступныя заданні: работа з вучэбна-метадычнай літаратурай па этнакультурным выхаванні, арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу і выканальніцкай дзейнасці гурту; фарміраванне этнафанатэкі і складанне вучэбных рэпертуарных зборнікаў для рэгіянальнай фальклорнай суполкі; разбор структуры абрадавай, рэкрэацыйнай дзеі і яе ўвасабленне ў палажэнне і сцэнарны план канцэрта, канцэрта-лекцыі, мастацкай рэканструкцыі свята, фестывалю, конкурсу; распрацоўка праекта вучэбнай праграмы фальклорнага гурту пэўнага профілю, плана-канспекта вучэбных заняткаў (рэпетыцыі) з ім; прагляд відэаматэрыялаў паводле спецыфікі працы з сучасным фальклорным калектывам, наведванне канцэртаў, выстаў народнай творчасці.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін» прадугледжана ўсяго 106 гадзін, з якіх 52 – аўдыторныя (лекцыі – 10, практычныя – 42) заняткі.

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | практ. | лекцыі |
| **Уводзіны** | 2 | | 2 |
| **Тэма 1.** Этнакультурнае выхаванне і навучанне ў сістэме культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь | 2 | | 2 |
| **Тэма 2.** Дзяржаўныя і грамадскія этнавыхаваўчыя праекты на аснове традыцыйнай народнай культуры | 2 | | 2 |
| **Тэма 3.** Дзяржаўныя вучэбна-выхаваўчыя і адукацыйныя стандарты навучання традыцыйным відам мастацтва | 2 | | 2 |
| **Тэма 4.** Фарміраванне навукова-метадычнай базы этнакультурнага выхавання, выкладання фальклорных дысцыплін | 6 | 4 | 2 |
| **Тэма 5.** Спецыфіка вучэбна-выхаваўчай работы на аснове традыцыйнай культуры ў сістэме адукацыйных устаноў | 12 | 12 | |
| **Тэма 6.** Шляхі і сродкі засваення фальклорнага мастацтва | 14 | 14 | |
| **Тэма 7.** Формы і метады арганізацыі вучэбнай і выканальніцкай дзейнасці | 12 | 12 | |
| **Разам …** | **52** | **42** | **10** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Прадмет і задачы дысцыпліны «Методыка выкладання спецдысцыплін». Фальклор як цэласная сістэма эстэтычнага і этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі. Кампанент традыцыйнай народнай культуры ў сучаснай вучэбна-выхаваўчай сістэме Рэспублікі Беларусь.

Фарміраванне ў навучэнцаў эстэтычнай патрабаванасці, нацыянальнай самасвядомасці, маральных і духоўных каштоўнасцей на аснове традыцыйнай культуры (нацыянальная тэорыя выхавання К. Д. Ушынскага). Высновы навукоўцаў, вопыт вядучых педагогаў Беларусі і замежжа ў галіне этнапедагогікі.

Шляхі і сродкі пераймання, актуалізацыі самабытных праяў традыцыйнай культуры ў сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы. Агляд навукова-метадычных матэрыялаў па этнапедагогіцы.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне дысцыпліны.

### Тэма 1. Этнакультурнае выхаванне і навучанне ў сістэме культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь

Нарматыўная база этнакультурнага выхавання і навучання, засваення і пераемнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, комплексныя праграмы і праекты па ажыццяўленні гэтых задач.

Праблемы бесперапыннай адукацыі этнакультурнага профілю (сярэдняя адукацыйная школа/установа дадатковай адукацыі – сярэдняя спецыяльная ўстанова – вышэйшая навучальная ўстанова). Некаторыя аспекты выкладання фальклорных дысцыплін на розных ступенях сістэмы адукацыйных устаноў.

### Тэма 2. Дзяржаўныя і грамадскія этнавыхаваўчыя праекты на аснове традыцыйнай народнай культуры

Фестывалі традыцыйнага мастацтва як рычаг стымулявання вучэбна-выхаваўчай дзейнасці ў этнакультурным рэчышчы.

Формы і метады ўключэння дзяцей і моладзі ў святочна-абрадавую цыклічнасць традыцыйнай культуры. Феномен этнадыскатэк мяжы XX–XXI стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 3. Дзяржаўныя вучэбна-выхаваўчыя і адукацыйныя стандарты навучання традыцыйным відам мастацтва

Тыповыя і эксперыментальныя вучэбныя праграмы па навучанні фальклору ў сістэме САШ, ССУ і ВНУ. Вучэбна-выхаваўчыя праграмы і метадычныя распрацоўкі па засваенні традыцыйнага мастацтва ў сістэме дадатковай адукацыі. Асновы планавання вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Праблемы падрыхтоўкі выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін у галіне традыцыйнай культуры і перспектывы іх выкладання ў сістэме агульнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

## Тэма 4. Фарміраванне навукова-метадычнай базы этнакультурнага выхавання, выкладання фальклорных дысцыплін

Даследаванні, прысвечаныя праблеме «Традыцыйная культура і дзеці» (Г. С. Вінаградаў, М. Ю. Навіцкая, Г. А. Барташэвіч, М. А. Козенка, А. Ю. Лозка, Т. І. Кухаронак, інш.). Вучэбна-метадычныя дапаможнікі. Рэпертуарныя зборнікі, сцэнарныя праекты. Камплектаванне аўдыявідэатэкі аўтэнтычных фальклорных матэрыялаў і постфальклорных узораў яго пераемнасці і адаптацыі ў сучаснай вучэбнай практыцы.

Прынцыпы складання вучэбна-выхаваўчых праграм па традыцыйных відах мастацтва. Распрацоўка праекта вучэбнай праграмы для дзіцячага фальклорнага гурту.

## Тэма 5. Спецыфіка вучэбна-выхаваўчай работы на аснове традыцыйнай культуры ў сістэме адукацыйных установ

Варыятыўнасць форм і метадаў засваення фальклору ва ўстановах культуры, адукацыі (агульнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай) і дадатковай адукацыі. Кірункі творчай дзейнасці аматарскіх калектываў розных тыпаў фальклярызму (профільныя мастацкія калектывы і сінкрэтычнага тыпу; калектывы другасных рэпрадуктыўных форм фальклярызму і стылізаваныя).

Паэтапнае планаванне вучэбна-выхаваўчага працэсу і дакументаванне яго зместу. Тыпы і структура заняткаў. Этапы рэпетыцыйнай работы ў фальклорным гурце. Прынцыпы фарміравання рэпертуару для розных узроставых груп калектыву.

Прынцыпы функцыянавання голасу ў рэжыме этнафанацыі (узроставыя асаблівасці развіцця голасу). Работа над трады-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйнай харэаграфіяй. Вусна-паэтычная творчасць і тэатральна-гульнёвая дзейнасць. Музычнае суправаджэнне і сцэнічнае ўвасабленне фальклорных праграм.

## Тэма 6. Шляхі і сродкі засваення фальклорнага мастацтва

Методыкі засваення традыцыйнага мастацтва ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці калектываў другасных форм фалькларызму: з вопыту вядучых выкладчыкаў фальклорных дысцыплін і этнапедагогаў краіны. Прынцыпы засваення фальклорных традыцый у дзіцячым, маладзёжным, дарослым фальклорных гуртах.

Метады мастацка-практычнай фальклarystыкі па вывучэнні і ўвасабленні традыцыйнага мастацтва ў аматарскай творчасці: метады вуснай перадачы і ўключанага назірання, тэхнічна апасродкаваны (аўдыявідэа) ілюстратыўны метад.

Педагагічныя метады: гутарка і расповед; паказ педагога; унушэнне і перакананне; заахвочванне і стымуляванне паводзін і дзейнасці; эмпатыя (эмацыянальнае пагружэнне ў фальклорны тэкст); самастойная работа і імправізацыя. Спецыяльныя метады засваення розных відаў традыцыйнага мастацтва.

## Тэма 7. Формы і метады арганізацыі вучэбнай і выканальніцкай дзейнасці

Гуртавыя (калектыўныя) і індывідуальныя заняткі. Адпраўленне гадавых свят ва ўмовах, набліжаных да іх аўтэнтычнага бытавання; масавыя танцавальна-гульнёвыя вечарыны, канцэрты, фестывалі, конкурсы, фальклорныя летнікі, музычна-тэматычныя лекцыі.

Методыка правядзення практычных заняткаў, лекцый па фальклорных дысцыплінах. Спалучэнне тэарэтычных і практычных форм выкладання і засваення матэрыялу. Прынцыпы адбору матэрыялаў для правядзення заняткаў: апора на аўтэнтычныя фальклорныя крыніцы, выкарыстанне запісаў з мастацкай практыкі сучасных фальклорных аб’яднанняў.

Рэпертуар як фактар выбудовы канцэпцыі калектыву. Паступеннасць фарміравання рэпертуару ў фальклорным гурце ў цыкле гадавых свят і рэкрэацыйнай практыкі. Жанрава-дыферэнцыраваны падыход да засваення і прэзентацыі фальклорнага матэрыялу адпаведна гендарным і ўзроставым крытэрыям навучэнцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Алексеев, Э. Е.* Фольклор в контексте современной культуры. Рассуждения о судьбах народной песни / Э. Е. Алексеев. – М.: Сов. композитор, 1988. – 238 с.

2. *Аляхновіч, А. М.* Народная песня ў мастацкай самадзейнасці / А. М. Аляхновіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1991. – 112 с.

3. *Болбас, В. С.* Этычная педагогіка беларусаў / В. С. Болбас. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 175 с.

4. *Грамовіч, І. М.* Методыка работы з фальклорным гуртам: курс лекцый / І. М. Грамовіч, Л. В. Снапкова. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 139 с.

5. *Грымаць, А. А.* Народная педагогіка беларусаў / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая, У. В. Пашкевіч. – Мінск: Ул. М. Скакун, 1999. – 256 с.

6. *Гусев, В. Е.* Фольклорные ансамбли как форма современного фольклоризма / В. Е. Гусев // Традиции и современность в фольклоре. – М.: Наука, 1988. – С. 199–212.

7. *Кабанов, А. С.* К проблеме сохранения фольклорной традиции в современных условиях / А. С. Кабанов // Художественная самодеятельность: вопросы развития и руководства: сб. тр. / НИИ культуры М-ва культуры РСФСР. – М., 1980. – Вып. 88. – С. 80–106.

8. *Калачова, І. І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання. Этнапедагагічная спадчына народаў Беларусі / І. І. Калачова. – Мінск: НІА, 1999. – 179 с.

9. *Калацэй, В. В.* Нарматыўна-прававыя аспекты дзейнасці па захаванні фальклору і этнакультурным выхаванні / В. В. Калацэй // Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур Беларусі / уклад. І. Ю. Смірновай; пад рэд. В. А. Лабачэўскай. – Мінск: БДУКіМ, 2008. – С. 10–15.

10. *Кузьмініч, М. Л.* Стандарт па спецыяльнасці «Народная творчасць (фальклор)» як мадэль падрыхтоўкі кадраў для галіны традыцыйнай народнай культуры // Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, пераймання: матэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыялы навук.-метад. канф. (15–16 сакавіка 2007 г.) / рэдкал.: М. Л. Кузьмініч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С. 3–19.

11. *Нарматыўнае* вытворча-практычнае выданне «Нарматыўна-прававыя дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці». – Вып. 4. – Мінск: БелІПК, 1999.

12. *Науменко, Г. М.* Фольклорная азбука: учеб. пособие для начальной школы / Г. М. Науменко. – М.: Издательский центр «Академия», 1996. – 136 с.

13. *Специфика* учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах (Методическое пособие). – М.: ВНМЦ НТ и КПР, 1984. – С. 88.

*Дадатковая*

1. *Виноградов, Г. С.* Детский фольклор (из истории русской фольклористики) / Г. С. Виноградов. – Л.: Наука, 1978. – 345 с.

2. *Виноградов, Г. С.* Страна детей. Избранные труды по этнографии детства / ред. А. В. Грунтовский. – СПб.: Анатолия, 1998. – 540 с. (Историческое наследие).

3. *Дзіцячы* фальклор: зборнік фальклорных матэрыялаў / рэдкал.: У. А. Васілевіч [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2006. – 359 с.

4. *Дмитриев, Л. Б.* Основы вокальной методики / Л. Б. Дмитриев. – М.: Музыка, 2007. – 368 с.: нот. ил.

5. *Камінскі, А. Я.* Рэжысура традыцыйнага абраду: вучэб.-метад. дапам. / А. Я. Камінскі. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 112 с.

6. *Лобанов, М. А.* Этносольфеджио на материале традиционной песни русской деревни: учеб. пособие для старших классов ДМШ и средних специальных учебных заведений. – СПб.: Северный олень, 1996. – 75 с.

7. *Сацыяльна-педагагічны* патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэб.-метад. дапам. / аўт.-склад.: Т. І. Кухаронак, В. Г. Кухаронак. – Мінск: БДПУ, 2005. – 108 с.

8. *Традыцыйная* культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 2. Матэрыялы III Рэспубліканскай навук.-практ. канф. (19–20 крас. 2006 г., г. п. Акцябрскі) / аўт. праекта і ўклад. М. А. Козенка. – Мінск: БелДІПК, 2006. – 224 с.: іл.

9. *Ушинский, К. Д.* Родное слово: книга для детей и родителей / сост., предисл., примеч., словарь, подгот. текста

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Н. Д. Ермолиной. – Новосибирск: Мангазея: Дет. лит., 1997. – 456 с.

*10. Федонюк, В.* Детский голос. Задачи и методы работы с ним / В. Федонюк. – СПб.: Союз художников, 2003. – 88 с.

*11. Этномузыкология.* Специальность 070112 (054000). Примерные программы дисциплин. Государственный образовательный стандарт. Примерный учебный план. Требования к материально-техническому обеспечению: сб. учеб.-метод. материалов и нормативных документов. – СПб.: Шатон, 2005. – 668 с.

*12. Этнопедагогика.* Теория и практика: Материалы XII Чтений, посвященных памяти Г. С. Виноградова. Авторские образовательные программы по фольклору / Ин-т Наследия; сост. А. Г. Айвазян. – М., 2003. – 224 с.

*13. «Этнашкола»* ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск: Бестпринт, 2004. – 255 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца традыцыйнай народнай культуры ў сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы, шляхоў і сродкаў засваення фальклорнага мастацтва ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці калектыву). Веданне фалькларыстычнай і навукова-метадычнай літаратуры па этнакультурным выхаванні і навучанні |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля бесперапыннай адукацыі этнакультурнага профілю, вучэбна-метадычных захадаў па вывучэнні і пераемнасці традыцыйнай культуры ў навучальных установах рознага тыпу), веданне асноўных форм і метадаў засваення фальклору ў аматарскім калектыве. Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё праблем этнакультурнага выхавання і навучання, фармуліроўка высноў. Уменне аналізаваць канцэптуальныя палажэнні этнакультурнага эстэтычнага выхавання, дзяржаўныя і эксперыментальныя праекты па яго ажыццяўленні. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 9 (дзе-вяць) | Усведамленне студэнтам працэсаў сацыяльнага пераасэнсавання фальклору ва ўмовах глабалізацыі і веданне інавацыйных шляхоў і сродкаў па ўкараненні яго каштоўнасцей у сучасную культурна-адукацыйную прастору, асэнсаванне вопыту пэўных дзеячаў і вядучых этнапедагогаў краіны, навуковых і грамадскіх устаноў па эстэтычным засваенні, рэвіталізацыі фальклору. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць формы і метады арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу і арганізацыі выканальніцкай дзейнасці гурту (з улікам набытых ведаў), выкладання этналагічных дысцыплін ва ўстановах адукацыі рознага тыпу, карыстацца навукова-метадычнай літаратурай па акрэсленых пытаннях. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзе-сяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем этнакультурнага выхавання і навучання, этнапедагогікі як навукі. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў выкладання фальклору і кіравання этнакультурнай суполкай рознага профілю, актуальных праблем этнапедагогікі на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па эстэтыцы і экалогіі традыцыйнай культуры, праблемах і тэндэнцыях мастацка-практычнай фалькларыстыкі, метадычна-даведачным фондам этнакультурнага выхавання і навучання |

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійнай кампетэнцыі, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках) напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05*
*Народная творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,55.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ